Год малой радзімы

# У ліку лепшых - кніга журналіста «НС»

У Мінску на пляцоўках Нацыянальнага гістарычнага музея прайшоў I рэспубліканскі краязнаўчы форум.

У мерапрыемстве паўдзельнічалі больш за 200 энтузіястаў і прафесійных даследчыкаў гісторыка-культурнай спадчыны рэгіёнаў краіны. Сярод іх - супрацоўнікі музеяў і бібліятэк, журналісты, гісторыкі і педагогі, студэнты і школьнікі.

З вітальным словам да прысутных звярнуўся старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу доктар гістарычных навук Ігар Марзалюк. Ён заклікаў суайчыннікаў памятаць, што за плячыма беларусаў вялікая гісторыя, якую кожны мусіць любіць і шанаваць.

Удзельнікі форуму падзяліліся назапашаным вопытам; звярнулі ўвагу на неабходнасць папулярызаваць веды аб спадчыне гарадоў і вёсак, распаўсюджваць сведкі аб краязнаўчых праектах, ствараць умовы для дыялогу паміж навукоўцамі. Гаворка ішла і аб патрыятычным выхаванні дзяцей і моладзі праз іх далучэнне да даследаванняў.

Была прынятая рэзалюцыя аб стварэнні Беларускага краязнаўчага таварыства. Намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Алесь Суша запрасіў удзельнікаў на міжнародны кангрэс, які пройдзе ў кастрычніку гэтага года. А былы Міністр замежных спраў краіны Пятро Краўчанка выступіў з прапановай стварыць нацыянальны пантэон волатаў беларускага духу.

Адбылася і цырымонія ўзнагароджання лаўрэатаў і пераможцаў конкурсу на выдатныя творы краязнаўчай літаратуры. Гран-пры атрымаў вядомы гісторык са Слоніма Сяргей Чыгрын. Лепшым даследаваннем у намінацыі «Гарады Беларусі» прызнана кніга «Старасвецкая Лошыца» літаратара, журналіста газеты «На страже» Юрыя Кур'яновіча. Яна прысвечана мінуламу і сённяшняму дню маёнтка-помніка сядзібна-паркавага мастацтва XVIII - XIX стагоддзяў.

*Уладзімір БАРЫСЕНКА.*

